

**ЗАБУРАЕВА Вера,**
студэнтка 3 курса
факультэта беларускай
і рускай філалогіі БДПУ.

Тэма: ***«Настаўнік, перад імем тваім...»***

**Настаўнік – абраны лёсам чараўнік. Пад яго ўздзеяннем і назіраннем нараджаюцца таленты, выяўляюцца геніі, аздабляюцца прыродныя здольнасці. Менавіта ён з'яўляецца тым правадыром у загадкавы свет ведаў і бясконцы карагод дзівосаў, які з цяплом, дабрынёй і клопатам прыме кожнага вучня як свайго асабістага члена сям'і. Настаўнік павінен быць моцным і мяккім, пяшчотным і строгім, адкрытым і загадкавым. І гэта – мой ідэал. Але ці кожны можа стаць настаўнікам? Ці кожны з тых, хто так завецца, валодае гэтымі і многімі іншымі неабходнымі якасцямі? Як змяніліся адносіны да прадстаўнікоў гэтай прафесіі з цягам часу? Паспрабуем адказаць на гэтыя пытанні.**

**Неяк мне давялося размаўляць з вопытным немаладым настаўнікам, які большую частку жыцця адпрацаваў у школе. Ён успамінаў былыя часы, сваіх дзяцей, якія ўжо таксама далёка не юнакі, узгадваў прыемныя моманты, цікавыя, часам вясёлыя гісторыі. Ён смяяўся і плакаў, быў шчаслівы і адначасова сумны. Але нішто ён не згадваў з такой пяшчотай у вачах і задавальненнем у голасе, як першыя яго працоўныя дні ў вясковай школе.**

**Успомнім вядомы ўсім твор Якуба Коласа «На ростанях». У трылогіі аўтар апісаў некалькі вобразаў настаўнікаў, але я хачу звярнуць увагу менавіта на стаўленне да маладога Лабановіча старой бабулі, у якой жыў узгаданы герой. Яна заўсёды з цеплынёй і павагай звярталася да юнака, бо той і выслухаць умеў, і павесяліць яе, і падтрымаць добрым словам. Сустракаюцца наступныя звароты: «панічак, панічку мілы,**

харошы паніч». Гэта, канешне, асабістыя зносіны канкрэтных людзей, а патлумачыць цеплыню між імі можна і тым, што сам Лабановіч быў добрым чалавекам, і бабка паважала яго менавіта за гэта, а не за працу настаўніка. Але нельга адмаўляць і тое, што пяшчота жанчыны да хлопца магла зарадзіцца менавіта з-за яго прафесіі.

Але ніхто не будзе паважаць настаўніка толькі за тое, што ён так завецца. Да ведаў па канкрэтным прадмеце трэба абавязкова дадаваць кемлівасць, працавітасць, творчасць, агульную эрудыцыю і прафесіяналізм. Такія рысы, без сумнення, павінны прысутнічаць у кожным, хто абраў для сябе гэты шлях. Тым не менш, нельга забываць пра агульначалавечыя якасці, адсутнасць якіх можа прывесці не толькі да дрэнных ведаў школьнікаў, але і да непапраўнай траўмы, скалечанага дзяцінства, жорсткай нянавісці, да сапраўднай катастрофы... Дзеці заўсёды ўспрымаюць усё глыбока, асабліва кепскае стаўленне. Некаторых з іх гэта вымушае страціць сябе, прыняць бок злачынцаў, вымяшчаць назапашаныя крыўды на іншых людзях. Здараецца і іншы варыянт развіцця падзей. У творы Янкі Брыля «Сірочы хлеб» галоўным героем з'яўляецца хлопчык Данік са складаным лёсам. На станаўленне яго асобы ўплывалі розныя настаўнікі. Настаўнікам жыцця можна назваць вясковага чалавека Міколу Кужалевіча, які заўсёды падтрымліваў хлапчука, дапамагаў карыснымі парадамі, даваў магчымасць выказаць свой пункт гледжання, дазваляў быць самім сабой. А польская настаўніца пані Мар'я паўплывала на фарміраванне светапогляду Даніка, дала штуршок да самаразвіцця. Але на долю хлапчука выпала быць знаёмым з настаўнікамі іншага гатунку: Цаба, Рузя і Дулемба. Гэтыя людзі былі нібы апантаныя сваімі ідэямі і нянавісцю да тых, хто думаў інакш. Даніку забаранялі не толькі гаварыць і чытаць па-беларуску, яму не давалі нават думаць на роднай мове. Падобных людзей нельга назваць настаўнікамі, бо яны не вучылі, а навязвалі свае асабістыя думкі. Такім настаўнікам нельга давяраць дзяцей, іх не павінна быць у школе, яны не маюць права дакранацца да дзяцінства, бо лёгка знішчаць яго.



Настаўнік павінен спалучаць у сабе розныя рысы характару. Ён не мае права быць з'едлівым, грубым, дакучлівым, а таксама – занадта добрым і мяккім, як Апалінарый Феактыставіч, па празванні Цыркуль з твора Івана Навуменкі «Настаўнік чарчэння». Дзеці часта карысталіся слабасцю яго характару, бывала, зрывалі заняткі. Але любілі яго і паважалі, бо той задавальняў іх дзіцячую цікавасць, з натхненнем расказваў пра незвычайныя рэчы, якія, часам, не тычыліся тэмы ўрока. Магчыма, гэта была інфармацыя, якая школьнікам не спатрэбіцца, але настаўнік лічыў сваім абавязкам наталіць жаданне сваіх вучняў даведацца пра нешта новае. І толькі вучань Косця Кветка шанаваў настаўніка за тое, што нельга было яго «назваць сухім і чэрствым. Ён быў старамодным, крыху напышлівым, але толькі не сухім».

Не існуе ідэальнага чалавека, але імкнуцца да таго самага ідэала трэба заўсёды. Добра, калі перад вачыма ёсць прыклад, а яшчэ лепш, калі гэтым прыкладам здолее стаць настаўнік. Вучні павінны бачыць перад сабой сапраўды годную, разумную і цікавую асобу, павінны імкнуцца да новых вяршынь, да цікавых адкрыццяў. Трэба памятаць, што гарызонт, які бачыць школьнік, адкрываюць не толькі бацькі і сябры, а менавіта настаўнік. Ён адыгрывае важную ролю ў фарміраванні дзіцячага мыслення, фантазіі, працаздольнасці і светаўспрымання. Пакалечыць можна і неасцярожным словам, а зацягнуцца рана не здолее ў адзін момант. Дзіцячы свет такі крохкі, што дотык неасцярожнай рукі можа парушыць падмурак, а на руінах, як вядома, будуюцца толькі руіны.

Успрыманне настаўнікаў у грамадстве мянялася на працягу многіх гадоў. У пэўны час іх лічылі інтэлігентамі, тыя, хто абраў гэты шлях, аўтаматычна станавіліся панамі. Іх паважалі. На іх глядзелі з цікавасцю. А хто такі настаўнік цяпер? Ды такі ж самы настаўнік. Той, хто можа падараваць ключ ад усіх дзвярэй. Той, хто дае магчымасць разгарнуцца таленту. Той, чые словы натхняюць на дасягненне вяршынь, хто пакажа сцежку да неабсяжных ведаў, навучыць карыстацца імі, падштурхне да заваявання Парнасу.